4. Карилин, М. Об итогах и перспективах / М. Карилин, А. Каледа // Советское строительство. – 1926. – № 11. – С. I–VI.
5. Торговая деятельность ЦБС // Белорусский кооператор. – 1923. – 15 сентября. – С. 5.
6. Обязательное постановление № 76 Витгубисполкома от 15 марта 1924 г. // Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б). – 1924. – 16 марта. – С. 5.
7. Войтенко, В. Кооперация в БССР / В. Войтенко // Советское строительство. – 1924. – № 1. – С. 47–59.
8. Каледа, А. Вопросы внутренней торговли Белоруссии / А. Каледа // Советское строительство. – 1924. – № 1. – С. 37–46.
9. Войтенко, В. Кооперация Белоруссии в первой половине 1925 хозяйственного года / В. Войтенко // Советское строительство. – 1925. – № 7–8. – С. 139–159.
10. Каледа, А. Торговля / А. Каледа // Советское строительство. – 1926. – № 1. – С. 87–103.

УДК 821.161.3

# АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ Ў ПЕРЫЯД НЭПА

Уткевіч В. І., дацэнт
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: беларусізацыя, літаратурны працэс, літаратурныя аб’яднанні, авангардызм, наватарства, культура, НЭП.

Рэферат. У артыкуле разглядаюцца асаблівасці літаратурнага працэсу на тэрыторыі БССР і ў Заходняй Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя, калі на тэрыторыях нашай рэспублікі разгортвалася палітыка НЭПа. Адзначаецца, што беларуская літаратура дадзенага перыяду развівалася ў двух накірунках: традыцыйным і наватарскім. Творчыя пошукі беларускіх пісьменнікаў тычацца як зместу, так і формы твораў. Наватарства, авангардызм у беларускай літаратуры праявіліся галоўным чынам у паэзіі, якая больш чуйна і хутка адгукаецца на сацыяльныя змены. У прозе з’яўляюцца новыя жанры, выходзяць першыя беларускія раманы.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі (НЭПа) уяўляе сабой у многіх адносінах супярэчлівую спробу сумясціць сацыялістычныя прынцыпы кіравання дзяржаўнай эканомікай (у першую чаргу гаворка тут аб буйной прамысловасці і транспарце) з некаторымі эканамічнымі законамі таварнай вытворчасці і выкарыстоўваць феномен прыватнакапіталістычнага прадпрымальніцтва ў інтарэсах пабудовы сацыялістычнага грамадства. На наш погляд, практыка вырашэння дадзенай супярэчнасці не была дыялектычнай. Хутчэй за ўсё, спроба сумяшчэння зрабілася праявай своеасаблівай эклектыкі. Прычым нават і ў той час многія кіруючыя дзеячы бальшавіцкай улады адкрыта выступалі супраць НЭПа.

Неабходна адзначыць, што эклектыка выяўлялася не толькі ў чыста эканамічнай галіне, але таксама і ў палітычнай, сацыяльнай і культурнай. Асабліва ярка гэта было відаць на тэрыторыі Беларусі. Уся справа ў тым, што па меры змены сацыялістычнай эканамічнай сістэмы адначасова у сферы нацыянальна-культурнай палітыкі кампартыі нашай рэспублікі актыўна прасоўваецца такі кірунак развіцця, які атрымаў назву “беларусізацыя”. Мэтай дадзенай палітыкі з’яўлялася прыстасаванне кіраўніцкага дзяржаўнага апарату да беларускай мовы, якая лічылася роднай для насельніцтва на

тэрыторыі БССР. Адметна і паказальна, што працэс беларусізацыі практычна закрануў не толькі чыста моўную сферу, але і ўсе іншыя сферы-культурнага будаўніцтва той часткі Беларусі, якая апынулася пад бальшавіцкай уладай. Для апраўдання ажыццяўлення дадзенай палітыкі сфармавалася ідэя аб тым, што яна б магла ўнесці істотныя пазітыўныя змены ў дзяржаўнае будаўніцтва нашай рэспублікі, а таксама спрыяла б фармаванню самасвядомасці народа.

Феномен развіцця беларускай культуры перыяду НЭПа атрымаў назву "культурная рэвалюцыя". Важна разумець, што змены, якія адбываліся, таксама былі часта супярэчлівымі і неаднароднымі. Так, напрыклад, з аднаго боку, у многіх галінах культурнай дзейнасці паўсталі арганізацыі, якія імкнуліся да стварэння прынцыпова новай, так званай "пралетарскай" культуры. Натуральна, што адстойванне інтарэсаў нацыянальнай культуры разглядалася пралеткультаўцамі як чужыя і варожыя сацыялізму дзеянні, а, такім чынам, варожыя і ўсяму простаму народу. Натуральна, што супраць носьбітаў такіх варожых поглядаў былі ажыццёўлены масавыя рэпрэсіі, падчас правядзення якіх пацярпела мноства прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

Галоўнай тэматыкай твораў беларускай культуры розных галін мастацтва ў гэтыя часы зрабілася адлюстраванне рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, а таксама заклік да калектывізацыі (сама ж калектывізацыя атрымала масавы размах, як вядома, толькі пасля згортвання НЭПа). Пераважная ўвага пры стварэнні літаратурных вобразаў надавалася такім героям, хто не толькі прыняў савецкую ўладу, але і актыўна змагаўся за яе станаўленне і ажыццяўленне практычных пераўтварэнняў. Такая мастацкая канцэпцыя стаўлення да рэальнага жыцця была дастаткова рамантычнай і шмат у чым аднабаковай, напазбежна суправаджалася вялікай ступенню гераізацыі рэвалюцыянераў і будаўнікоў новага грамадства.

Аднак, разам з адзначанымі негатыўнымі наступствамі "культурнай рэвалюцыі", адначасова існавалі і некаторыя станоўчыя вынікі ў развіцці культуры ў дадзены гістарычны перыяд. Так, нягледзячы на ажыццяўленне найжорсткага ідэалагічнага кантролю з боку савецкай улады, з'явіліся новыя выбітныя літаратурныя творы. Акрамя таго, пастаянна павышаўся агульны ўзровень адукацыі насельніцтва. Напрыклад, непісьменнасць была ліквідаваная раней, чым у іншых рэспубліках Савецкага Саюза, ўведзена ўсеагульная і абавязковая пачатковая, а пасля і сямігадовая адукацыя. Павялічвалася колькасць вышэйшых навучальных устаноў, дзякуючы чаму вялікіх поспехаў дамаглася беларуская навука.

Трэба разумець, што бальшавікі ў асноўным не падтрымлівалі беларускі рух. Уся справа ў тым, што ў СССР панавала марксісцка-ленінская ідэалогія, характэрнай адзнакай якой быў інтэрнацыяналізм. Вядома, такая ідэалогія не магла быць адкрыта антыбеларускай. Уся справа ў тым, што ў яе межах абвяшчалася ідэя аб тым, што царская дарэвалюцыйная Расія была турмой народаў, у якой панаваў вялікадзяржаўны рускі шавінізм. Беларусы, згодна з дадзенай кропкай гледжання, патрапілі ў лік прыгнечаных нацыянальных меншасцяў. У адпаведнасці з такой канцэпцыяй было неабходна падтрымліваць нацыянальнае адраджэнне. Аднак гэта адраджэнне разумелася не як нацыяналістычнае і дробнабуржуазнае, а як сацыялістычнае, што значыла – інтэрнацыянальнае.

Нягледзячы на ўсю супярэчлівасць і неадназначнасць, 20-я гады мінулага стагоддзя вызначаюцца шэрагам разнастайных станоўчых падзей, якія шмат у чым спрыялі самабытнаму культурнаму развіццю беларускага народа. Менавіта як вынік палітыкі беларусізацыі, якая праводзілася савецкімі ўладамі ў той час, трэба адзначыць той факт, што ўжо ў 1921 годзе на Беларусі было адчынена шэсць тысяч школ, у якіх навучанне вялося поўнасцю па-беларуску. Усе дзяржаўныя ўстановы, а таксама прыблізна 80 % газет перайшлі на беларускую мову, якая атрымала статус дзяржаўнай. Руская ж мова разглядалася і замацоўвалася як сродак зносін з іншымі рэспублікамі

СССР. У 1922 годзе Ў Мінску быў адкрыты Інстытут беларускай культуры (знакаміты Інбелкульт), на аснове якога в 1929 году ўтворана Акадэмія навук. У 1921 годзе распачаў сваю дзейнасць Беларускі дзяржаўны універсітэт, які аб’яднаў некалькі факультэтаў. БДУ адразу зрабіўся буйным адукацыйным цэнтрам, менавіта на яго падмурку стварыліся з цягам часу дзяржаўныя педагагічны, медыцынскі і іншыя інстытуты. Тады ж пачала працу з чытачамі Дзяржаўная публічная бібліятэка.

У гэтых умовах нацыянальнага ўздыму стваралася новая беларуская літаратура. Як ужо сказана, яна разам з усёй культурай фарміравалася ў выключна складаных грамадска-палітычных абставінах. Напачатку 1920-х яе плённаму развіццю спрыяла абвешчаная ў краіне палітыка беларусізацыі. Такая ідэалагічная устаноўка дэтэрмінавала з’яўленне пісьменніцкіх арганізацый, а таксама фарміраванне новых мастацкіх прынцыпаў, абнаўленне беларускіх літаратурных традыцый. Аднак, забягаючы наперад, заўважым, што гэты рух быў прыпынены і па сутнасці знішчаны ў 1930-я гады пад уздзеяннем негатыўных знешніх абставін.

Літаратурны працэс ў перыяд НЭПа ўяўляў сабой не толькі працяг дарэвалюцыйнай традыцыі. Ён таксама характарызуецца з’яўленнем двух новых эстэтычных накірункаў: “бурапеннага” (неалагізм “бурапена” ўжыты ўпершыню А. Александровічам) і “ажыўленскага” (гэты тэрмін прапаноўваў А. Бабарэка). Узаемасувязь прадстаўнікоў абодвух гэтых кірункаў з дарэвалюцыйнай літаратурнай традыцыяй заключалася ў тым, што яны засноўвалі сваю творчасць на ідэях нацыянальнага адраджэння. Аднак паміж імі існавала і адрозненне, якое заключалася ў тым, што бурапенаўцам ідэал адраждения ўяўляўся далёкім ад свайго завяршэння. У сувязі з гэтым, некаторыя з прадстаўнікоў дадзенага кірунку па сутнасці адмаўлялі саму магчымасць вырашэння такой лёгкай і дасягальнай у паслярэвалюцыйны час мэты, як аднаўленне, сцвярджэнне годнасці беларусаў як народа. Ідэал беларушчыны яны ўбачылі зусім у іншым. Сваю мэту ўслед за М. Багдановічам (артыкул “Забыты шлях”) ажыўленцы бачылі ва ўключэнні беларускага ў сусветнае, агульначалавечае. Развіццю новых плыняў спрыялі літаратурныя часопісы: “Полымя” (1922), “Маладняк” (1923), “Узвышша” (1926), а таксама літаратурныя аб’яднанні “Маладняк” (1923), “Узвышша” (1926), “Полымя” (1927), БелАПП (1928). Адзначым, што колькасць сяброў “Маладняка” расла вельмі хуткім тэмпам і дасягнула 500 чалавек менш чым праз год існавання. Неабходна разумець, што для беларускай літаратуры гэта вельмі вялікая лічба, якая сведчыць аб феномене масавага далучэння людзей да літаратуры. Безумоўна, гэта у некаторай ступені з’явілася следствам першапачатковай нацыянальнай палітыкі бальшавікоў, якія прынялі новую лінію, так званы “нацыянальны НЭП”. На тэрыторыях нашай рэспублікі гэта палітыка атрымала шырокае развіццё пачынаючы з 1923 года. Менавіта тады нацыянальнае пытанне было пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсіх дзяржаўных і партыйных з’ездаў і канферэнцый, пленумаў і пасяджэнняў.

Вядома, беларускія пісьменнікі не маглі ў сваёй творчасці не адлюстраваць тыя гістарычныя падзеі, сведкаімі якіх яны зрабіліся напачатку ХХ стагоддзя. Умоўна, па спосабу адлюстравання гэтых падзей, пісьменнікаў можна падзяліць на дзве групы. У першую групу ўвойдуць тыя, хто імкнуўся не проста растлумачыць, але таксама і аксіялагічна апраўдаць феномен гвалту над прыгнятальнікамі працоўнага народа, як працэс класавай помсты ў адносінах да іх. Да ліку дадзеных пісьменнікаў можна аднесці Змітрака Бядулю, а таксама маладзейшае пакаленне. Прадстаўнікі другой групы сваёй задачай зрабілі адлюстраванне ў літаратурным творчасці пэўных элементаў старой, яшчэ дарэвалюцыйнай свядомасці. Лідарам гэтага кірунку можна лічыць Максіма Гарэцкага. Такім чынам, гэтыя пісьменнікі прытрымліваліся пазіцый агульначалавечых каштоўнасцей, а для маладзейшага пакалення эстэтычны ідэал меў

ярка выяўлены сацыяльны характар: грамадскае рабілася важнейшым за індывідуальнае.

Для прозы разглядаемага перыяду характэрна стварэнне вобраза "новага чалавека". Такі вобраз быў цэнтральным у творах Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Кандрат Крапівы, Платона Галавача. У пабудове сюжэту акцэнт рабіўся на гераізме, знешніх эфектах, перавазе прыгодніцкай сюжэтнай лініі, што спрыяла і прадвызначала развіццё ўласнага беларускага кінематографа. Так, напрыклад, першы беларускі мастацкі фільм "Лясная быль" быў створаны ў 1926 годзе рэжысёрам Юрыем Тарычам паводле твора Міхася Чарота "Свінапас".

Прыблізна ў гэты ж час былі напісаны першыя беларускія раманы. Яны ўяўлялі сабой сапраўды эпічныя палотны, творы буйной формы. Дадзены факт сведчыць пра ўзыходжанне беларускай літаратуры на якасна новы ўзровень. Дастаткова ўзгадаць "Сокі цаліны" Цішкі Гартнага, "Сцежкі-дарожкі" Міхася Зарэцкага, "Сястру" і "Зямлю" Кузьмы Чорнага. Акрамя таго, знакаміты класік айчыннай літаратуры Якуб Колас напісаў дзве аповесці з будучай трылогіі – "У палескай глушы" і "У глыбі Палесся". Упершыню ў беларускай літаратуры XX стагоддзя з'явілася рабочая (Міхась Лынькоў), эміграцкая (Максім Гарэцкі), прыгодніцкая (Янка Маўр) тэматыка.

Вядома, што ў сакавіку 1921 года быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, у адпаведнасці з якім тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі: Заходнюю (пад уладай Польшчы) і Усходнюю (пад уладай СССР). У першай палове 1920-х гадоў многія дзеячы беларускай культуры жылі там пастаянна: такія як Ф. Аляхновіч, Ядвігін Ш, а некаторыя туды трапілі на пэўны час з-за рэвалюцыйных падзей: М. Гарэцкі, У. Жылка, І. Канчэўскі, У. Самойла. Менавіта ў Вільні ў 1920 годзе М. Гарэцкі напісаў грунтоўнае даследаванне "Гісторыя беларускае літаратуры", у якім быў прааналізаваны цэласны літаратурны працэс Беларусі ад старажытнасці да сучасных аўтару дзён. Гэты тэкст стаў асновай беларускага літаратуразнаўства. Мастацкія творы самога Гарэцкага сталі пачаткам заходнебеларускай прозы. Адрознай адметнасцю яго прозы з'яўляецца філасофская глыбіня, уключанасць у агульнаеўрапейскую літаратурную традыцыю, пошукі вытокаў нацыянальнага характару беларусаў.

У заходнебеларускай паэзіі пачатку 1920-х гадоў усхвалялася нацыянальнае адраджэнне (К. Сваяк, М. Краўцоў). Драматургію літаратуры Заходняй Беларусі складалі асобныя драматычныя абразкі Максіма Гарэцкага, камедыі і драма "Пакрыўджаныя" Л. Родзевіча, а таксама п'есы Ф. Аляхновіча, пабудаваныя на аснове фальклорных сюжэтаў і па матывах папулярнай і моднай "новай драмы" Генрыка Ібсена (п'еса Аляхновіча "Няскончаная драма").

У другой палове 1920-х гадоў у літаратуру заходняй часткі Беларусі прыйшло новае пакаленне паэтаў, якое адстойвала сваю беларускасць насуперак польскім уладам і салідарызавалася з савецкай Беларуссю: Міхась Машара, Міхась Васілёк, Валянцін Таўлай і інш. У іх творах панавалі матывы народнай волі, заклікі да вызвалення. Асноўная тэматыка літаратурных твораў была звязаная з барацьбой беларускага народа з польскімі акупантамі. У савецкія часы гэткія лозунгі набылі не толькі нацыянальнае, але і новае сацыяльнае значэнне. Польская дзяржава паўставала ў творах некаторых беларускіх пісьменнікаў у якасці класавага несправядлівага грамадства, а барацьба з такім грамадствам мела ўжо не толькі нацыяльны сэнс, але і сацыяльнае значэнне. Такім чынам, вызваленне ад польскіх акупантаў з наступным уваходжаннем заходнебеларускіх зямель у склад савецкай Беларусі ўяўлялася як акт незалежнасці.

Паэзія савецкай Беларусі ў перыяд НЭПа развівалася ў дзвюх ідэйна-эстэтычных плынях. Першы накірунак прадстаўляецца пераважна традыцыйным, найбольш вядомымі яго прадстаўнікамі былі Уладзімір Жылка, Тодар Кляшторны, Наталля Вішнеўская, Яўгенія Пфляўмбаум, Зінаіда Бандарына і інш. У якасці ўзору і

тэарэтычна-метадалагічнай асновы сваёй паэтычнай творчасці яны ўзялі "нашаніўцаў": такіх, як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. Другі накірунак у метадалагічных адносінах быў цесна звязаны з ідэяй эстэтычнага эксперыменту, туды ўвайшлі прадстаўнікі так званай "пралетарска-рэвалюцыйнай суполкі": Міхась Чарот, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч і інш.

У агульным мастацкая беларуская літаратура павінна была не выходзіць за рамкі афіцыйнай ідэалогіі Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу. Адпаведна, у ёй выяўляліся культ рэвалюцыі, жыццесцвярджальны пафас, індустрыяльная тэма, ігнараванне лірычных пачуццяў, антырэлігійнасць. Аднак многія беларускія пісьменнікі шукалі шляхі перадолення тэндэнцыйнасці. Адным са спосабаў зрабіўся такі эстэтычны прыём, як іншасказальнасць і метафарычнасць.

Цікава адзначыць, што афіцыйная ідэалогія савецкай улады была цесна ўзаемазвязана з авангардызмам. Ён выяўляўся не толькі ва ўсебаковым адмаўленні дарэвалюцыйнага жыцця, але таксама ў пафасе пабудовы новага безкласавага грамадства. Адпаведна, не толькі мастацкая літаратура, але і само грамадскае жыццё ў Савецкай Беларусі 20-х гадоў адпавядала рысам авангардызму. У межах дадзенай ідэалогіі асноўным, ключавым рабіўся месіянскі вобраз будучай усясветнае камуны, якая ўяўлялася ў якасці абсалютнага ідэалу грамадскага быцця, з прыходам якога надыдзе шчаслівае жыццё для ўсіх простых працоўных людзей. Метадалогія аваргардызму адразу афармілася ў авангардысцкую плынь рэвалюцыйнага канцэптуалізму. По сваёй сутнасці гэты літаратурна-мастацкі рух у беларускай культуры быў шмат у чым справакаваны развіццём еўрапейскага, а таксама рускага авангардызму ў папярэдняе дзесяцігоддзе. У гэтым плане прарочымі аказаліся словы К. Малевіча з яго працы "Аб новых сістэмах у мастацтве", напісанай яшчэ ў 1919 годзе. Мастак і паэт адзначаў, што кубізм і футурызм былі з'явамі рэвалюцыйнымі ў мастацтве, што папярэдзілі і рэвалюцыю ў эканамічным і палітычным жыцці. Наватарства, авангардызм у беларускай літаратуры праявіліся галоўным чынам у паэзіі, якая больш чуйна і хутка адгукаецца на сацыяльныя змены. У беларускай літаратуры 20-х гадоў можна вылучыць наступныя наватарскія тэндэнцыі: з аднаго боку, пошукі ў галіне формы маладых творцаў, абумоўленыя рэвалюцыйнымі падзеямі, выкліканыя прагай "абнаўлення ўсяго свету", стварэння "новай літаратуры", новай паэтыкі; з другога – творы пісьменнікаў, для якіх пошукі ў галіне формы вынікалі з унутранай патрэбы абнаўлення мастацтва.

На думку І. Э. Багдановіч, "беларускі варыянт авангардызму склаўся ў межах "Маладняка" і часткова "Узвышша" [1, с. 220], супаўшы ў часе існавання з еўрапейскім. Беларуская літаратура 20-х гадоў характарызуецца нашымі даследчыкамі як адкрытая эстэтычная сістэма: вызначальным фактарам развіцця айчыннай літаратуры ў гэты час была стылёвая і жанравая разнастайнасць, суіснаванне, узаемаўплыў, узаемаўзбагачэнне розных мастацкіх тэндэнцый. Побач з рэалізмам плённа развіваліся рамантызм (паэзія "Маладняка", творы М. Зарэцкага), сімвалізм (творы Я. Купалы, Зм. Бядулі), натуралізм (творы М. Зарэцкага, Р. Мурашкі), імажынізм (творы Я. Пушчы, Т. Кляшторнага, А. Бабарэкі), эстэтызм (У. Жылка), канструктывізм (праграма літаратурна-мастацкіх аб'яднанняў "Маладняк", "Узвышша", "Беларускай літаратурна-мастацкай камуны"), футурызм (А. Александровіч, П. Шукайла, М. Чарот ), імпрэсіянізм (творы Я. Пушчы, К. Чорнага), экспрэсіянізм (творы Я. Купалы, Зм. Бядулі). Гэта сведчыць пра багацце стылёвай палітры тагачаснай беларускай літаратуры.

Такім чынам, перыяд развіцця беларускай літаратуры ў перыяд НЭПа, у 20-я гады мінулага стагоддзя з'яўляецца адным з самых інтэнсіўных у плане апрабацыі новых прыёмаў і прынцыпаў выяўлення. Імкненне да мадэрнізацыі эстэтычнай формы, пошукі новых шляхоў мастацкага выяўлення былі вызначальнымі перш за ўсё для твораў маладых пісьменнікаў. Змена сацыяльнага ладу закранула ўсе сферы жыцця

грамадства, у тым ліку і прыгожае пісьменства. Маладыя пісьменнікі, што далучыліся да мастацкай творчасці пасля рэвалюцыі, праходзілі перыяд творчага станаўлення ў атмасферы палемікі, спрэчак, пераглядy літаратурнай і мастацкай спадчыны. Разам з тым, натхнёнасць, пасіянарнасць, упэўненасць ва ўласных сілах прымушалі верыць, што яны здольныя стварыць новае мастацтва, літаратуру, якіх яшчэ не існавала дагэтуль. Адсюль – і фармальныя пошукі і лозунгі накшталт "далоў класікаў", "у рожкі са старымі". Неабходна таксама ўлічваць і паскораны характар развіцця нацыянальнай літаратуры, што прымушала творцаў выпрабоўваць самыя розныя сродкі мастацкай выразнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя / І. Э. Багдановіч – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 387 с.

УДК 94 (47)

## ТРАГІЧНЫ ЛЁС ТЭАРЭТЫКА НЭПА МІКАЛАЯ ДЗМІТРЫЕВІЧА КАНДРАЦЬЕВА

Хаданёнак В.М., загадчык кафедры
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: новая эканамічная палітыка, тэорыя эканамічных цыклаў, эканамічная статыка і дынаміка, рэпрэсіі, рэабілітацыя, навуковая школа.

Рэферат. Артыкул прысвечаны разгляду пакручастага жыццёвага, навуковага і творчага шляху аднаго з самых выдатных вучоных-эканамістаў ХХ стагоддзя – Мікалая Дзмітрыевіча Кандрацьева.

Новая эканамічная палітыка і яе рэалізацыя на тэрыторыі савецкай Беларусі і Расіі заўжды прыцягвала да сябе пільную ўвагу навукоўцаў. Яна сапраўды была новай і шмат учым унікальнай з'явай, калі разглядаць яе ў агульным кантэксце эканамічных і палітычных мерапрыемстваў савецкай улады. Адным з асноўных яе тэарэтыкаў быў вядомы вучоны-эканаміст Мікалай Дзмітрыевіч Кандрацьеў. Барацьба з іншадумствам і пошук ворагаў ва ўсіх катэгорыях насельніцтва прывялі да зняволення, а затым і смяротнага пакарання аднаго з самых таленавітых эканамістаў ХХ стагоддзя.

Першая сусветная вайна (1914–1918 гг.) паклала пачатак працягламу сацыяльна-палітычнаму і эканамічнаму крызісу, які яшчэ больш узмацніўся з-за рэвалюцыйных падзей 1917 г. і грамадзянскай вайны. Адбываліся структурныя змены ў палітычным, эканамічным, культурным і грамадскім жыцці. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, за даволі НЭПрацяглы перыяд часу, была нацыяналізавана амаль уся прамысловасць, апроч дробнай і саматужнай. Устанаўлівалася манаполія на пераважную большасць харчовых прадуктаў і сыравіны. Свабодныя рынкавыя адносіны сталі немагчымымі, а сістэма дзяржаўнага планавання і кіравання была строга цэнтралізавана. У 1922 г. пакупніцкая здольнасць рубля ў параўнанні з 1917 г. знізілася ў 74 разы [1, с. 347]. У 1922–1924 гг. інфляцыя дасягнула неверагодных маштабаў: у абарачэнні былі грашовыя купюры ў мільёны і мільярды рублёў [2, с. 246].

З 8 па 16 сакавіка 1921 г. у Маскве праходзіў Х з'езд Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) [3, с. 5]. Менавіта ён стаў паваротным пунктам у пераходзе краіны да НЭПа. Новая эканамічная палітыка разглядалася ў першую чаргу як цыкл